ся новым прысутнасцям па воінскай павіннасці[1]. Новыя органы падпарадкоўваліся Міністэрству ўнутраных спраў і ваеннаму ведамству. Губернскую па воінскай павіннасці прысутнасць узначальваў губернатар. Установа не мела свайго асобнага штата і складалася з асноўных службовых асоб губерні. На месцах утвараліся павятовыя па воінскай павіннасці прысутнаці на чале з павятовым прадвадзіцелем дваранства.

## 3.3. Органы паліцыі і жандармерыі

*(А. П. Жытко, С. А. Талмачова, А. А. Падарожняя)*

Важная роля ў сістэме мясцовых органаў улады і кіравання адводзілася паліцыі і жандармерыі. Губернатару і губернскаму праўленню ў павеце падпарадкоўваўся ніжні земскі суд – паліцэйскі орган, які складаўся з абіраемых дваранствам павета земскага спраўніка ці капітана і 2–3 засядацелей. Ніжні земскі суд выконваў распараджэнні вышэйстаячых улад, а таксама прыгаворы судоў, праводзіў папярэдняе следства па крымінальных злачынствах. На яго ўскладвалася асноўная паліцэйская функцыя – захоўваць у павеце добрапрыстойнасць і парадак. Асобным клопатам павятовай паліцыі было тое, каб ніхто не прымаў і не ўкрываў беглых людзей. Да ведамства ніжніх земскіх судоў адносіліся і іншыя паліцэйскія задачы: прымушэнне падатковага насельніцтва да спраўнай уплаты падаткаў і збораў, выкананне натуральных павіннасцей, назіранне за парадкам у час гандлю, харчовымі справамі і станам дарог, выкананнем супрацьпажарных і супрацьэпідэмічных мер і г. д.

Асаблівасцю арганізацыі земскай паліцыі на тэрыторыі Беларусі пры Паўле I з’яўлялася адсутнасць двух засядацелей ад «пасялян» і немагчымасць самастойна падбіраць людзей на пасады сакратароў для зацвярджэння іх губернскім праўленнем. У сваёй дзейнасці службоўцы ніжняга земскага суда кіраваліся толькі «Учреждения для управления губерний...» 1775 г. Усё справаводства вялося на рускай мове. Навaўвядзеннем у арганізацыі земскай паліцыі стала адмена дваранскіх выбараў на пасады спраўніка і засядацелей, прычым такая змена адбылася ў рамках

[1] ПСЗРИ. – Собр. 2-е. – Т. 49 (1874). – Отд. 1. – № 53520. – С. 771–772.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ